

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс**
**дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №8 (24)
Красавік 2022

## У нумары:

**Віншуем пераможцаў!!!** — **Стар. 1**
**Тыдзень дзіцячай кнігі** — **Стар. 2**
**Рэспубліканскі алімпійскі ўрок-2022** — **Стар. 3**
**Сустрэча з прадстаўнікамі пракуратуры і РАУС** — **Стар. 4**
**ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна** — **Стар. 5**
**Шосты школьны дзень** — **Стар. 6**

# Віншуем пераможцаў!!!



2 красавіка 2022 года на базе дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія г.Дзяржынска" адбыўся раённы злёт-конкурс атрадаў юных інспектараў дарожнага руху. У злёце-конкурсе прынялі ўдзел атрады ЮІД 17 установаў адукацыі.

Па выніках усіх конкурсаў самым лепшым атрадам ЮІД сярод сельскіх установаў адукацыі стаў атрад нашай школы – “Клаксон”!!!

9 і 16 красавіка вучні 4-9 класаў нашай школы прынялі ўдзел у раённай дыягнастычнай алімпіядзе "Алімпіядныя надзеі". Рабяты праявілі сябе з самага лепшага боку і папоўнілі скарбонку нашых дасягненняў наступнымі вынікамі:

**Дыплом I ступені** (французская мова) – **Далжук Дар'я**, вучаніца 5 класа.
**Дыплом II ступені** (французская мова) - **Ярашэвіч Мар'яна**, вучаніца 7 класа.
**Дыплом II ступені** (біялогія) - **Агарак Міхаіл**, вучань 7 класа.
**Дыплом III ступені** (інфарматыка) - **Казаран Канстанцін**, вучань 7 класа.

**Віншуем пераможцаў і жадаем далейшых перамог!!!**

# Тыдзень дзіцячай кнігі



Тыдзень дзіцячай кнігі - традыцыйнае свята, а дакладней, цэлы комплекс святочных мерапрыемстваў, прысвечаных дзіцячай літаратуры і яе героям. Свята, створанае дзіцячымі пісьменнікамі для ўсіх аматараў чароўных казак і аповесцей, раманаў і апавяданняў, вершаў і лічылак - словам, усіх твораў для дзяцей, малых і падлеткаў.

Традыцыйна на пачатку красавіка ў школе прайшоў Тыдзень дзіцячай кнігі. Мэта мерапрыемства - расказаць навучэнцам аб гісторыі ўзнікнення свята, азнаёміць з жыццём і творчасцю пісьменнікаў, далучыць дзяцей да чытання, развіць любоў да кніг і навучыць беражліваму стаўленню да іх.

У рамках мерапрыемства 29 сакавіка ў школьнай бібліятэцы дзеці самастойна аформілі выставы дзіцячых кніг, прынялі ўдзел у конкурснай праграме па творах Ханса Хрысціяна Андэрсана пад назвай "Дацкі казачнік" і конкурсе па вырабе закладак і вокладак для кніг.

30 сакавіка ў холе школы была аформлена "Полка дабра". Кожны навучэнец мог паўдзельнічаць у добраахвотнай акцыі "Падары кнігу бібліятэцы" і папоўніць бібліятэчны фонд новымі кнігамі.

31 сакавіка вучні паказалі свае веды ў віктарыне "Знатакі літаратуры".

1 красавіка прайшла конкурсная праграма "Падарожжа ў свет загадак".

2 красавіка адбылося закрыццё Тыдня дзіцячай кнігі, узнагароджанне ўдзельнікаў мерапрыемства і салодкае чаяванне.

У ходзе мерапрыемства хлопчыкі і дзяўчынкі з задавальненнем адказвалі на няпростыя пытанні і выконвалі складаныя заданні, якія пад сілу толькі ўважліваму чытачу. Дзякуючы сваім ведам, яны лёгка пазнавалі любімых казачных герояў, адгадвалі загадкі і разгадвалі крыжаванкі. Тыдзень дзіцячай кнігі быў вясёлым і займальным. І нягледзячы на тое, што ён завяршылася, сустрэчы з добрай і цікавай кнігай будуць працягвацца ўвесь год. Бібліятэка заўсёды будзе рада бачыць сваіх любімых чытачоў.









# Рэспубліканскі алімпійскі ўрок-2022




Беларуская алімпійская акадэмія ў першай дэкадзе красавіка праводзіла акцыю "Рэспубліканскі алімпійскі ўрок - 2022". Правядзенне акцыі было прымеркавана да Міжнароднага дня на карысць развіцця і міру, які адзначаўся 6 красавіка.

6 красавіка ў 3 класе прайшоў Алімпійскі ўрок-2022. Дзеці актыўна выконвалі заданні страшнай чараўніцы Бастынды. Збіралі з пазлаў талісманы Алімпійскіх гульняў у Токіа-2020 і Алімпійскіх зімовых гульняў у Пекіне-2022. Адкрылі сакрэт лагатыпа Алімпійскіх гульняў у Пекіне. Расшыфравалі дэвіз "Хутчэй, вышэй, мацней-разам!". У воблаку слоў выбралі словы - віды спорту. За выкананыя заданні атрымлівалі іскрынку і запальвалі алімпійскі факел. Не ўсе заданні атрымалася выканаць, таму зарабілі сярэбраныя медалі. Урок быў вельмі цікавым і пазнавальным.






7 красавіка Алімпійскі ўрок-2022 у 5-9 класах правёў настаўнік фізічнай культуры і здароўя Рыбак А.А.



Правядзенне Алімпійскага ўрока стала яркай падзеяй, якая дазволіла даведацца шмат новага і цікавага пра атрыбуты і асаблівасці правядзення гульняў Алімпіяды ў Токіа і Алімпійскіх зімовых гульняў у Пекіне. Галоўная мэта такіх мерапрыемстваў - нагадаць школьнікам аб тым, як важна весці здаровы лад жыцця, займацца фізкультурай і спортам.

# Сустрэча з прадстаўнікамі пракуратуры і РАУС



21 красавіка адбылася сустрэча вучняў 5-9 класаў з Карцавай Таццянай Анатольеўнай, памочнікам пракурора раёна, Цупрун Ксеніяй Мікалаеўнай, начальнікам інспекцыі па справах непаўналетніх Дзяржынскага РАУС, і Ткачовым Аляксандрам Яўгенавічам, старшым участковым інспектарам інспекцыі па справах непаўналетніх Дзяржынскага РАУС.

У ходзе гутаркі госці акцэнтавалі ўвагу школьнікаў на тым, што крымінагенная абстаноўка на аб'ектах чыгуначнага транспарту ў бягучым годзе характарызуецца наяўнасцю шэрага негатыўных тэндэнцый: зарэгістраваны факты незаконнага ўмяшання ў дзейнасць чыгуначнага транспарту. Асаблівую трывогу выклікае ўчыненне правапарушэнняў на аб'ектах чыгункі непаўналетнімі (накладанне камянёў, дроту на чыгуначныя пуці, пашкоджанні стрэлачнага механізму). Актуальнымі застаюцца і пытанні, звязаныя са здзяйсненнем дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам непаўналетніх, а таксама злачынстваў у сферы незаконнага абароту наркотыкаў.

Чыгунка для ўсіх, а для дзяцей асабліва - зона павышанай небяспекі. Але, як ні дзіўна, менавіта яна прыцягвае падлеткаў для гульняў і забаў. Аднак сумная статыстыка павінна насцярожыць як непаўналетніх, так і дарослых, нагадаць ім, што толькі ад уважлівасці і выканання строгіх правілаў бяспечных паводзін залежыць здароўе, а часам і жыццё. Большасць няшчасных выпадкаў прыпадае на час школьных канікул. Самай распаўсюджанай прычынай траўматызму на чыгунцы з'яўляецца хаджэнне па шляхах, пераход іх у неўстаноўленых месцах.

**Памятайце!** Любое старонняе ўмяшанне ў дзейнасць чыгуначнага транспарту незаконнае! Яно праследуецца па закону і цягне за сабой крымінальную і адміністрацыйную адказнасць (за парушэнні правілаў бяспекі дзецьмі адказнасць нясуць іх бацькі).





# ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна

28 красавіка вучні 8-9 класы размаўлялі аб развіцці сельскай гаспадаркі ў Рэспубліцы Беларусь. Што стаіць за паняццем біятэхналогіі? Чым унікальная дзейнасць Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі? Якія шляхі атрымання прафесійнай адукацыі і перспектывы рэалізацыі маладых людзей у аграпрамысловым комплексе? Гэта тыя пытанні, якія зацікавілі рабят.





29 красавіка ў рамках рэалізацыі адукацыйнага праекта "ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна" для вучняў 5-6 класаў было арганізавана завочнае падарожжа "Славутасці Беларусі".

У фокусе абмеркавання былі наступныя паняцці: культурная спадчына, гістарычная памяць, любоў да Радзімы. У канцы мерапрыемства рабяты адказалі на пытанні віктарыны, паглыбілі і замацавалі свае веды аб славутых мясцінах Беларусі.









# Шосты школьны дзень




**16 красавіка** ў рамках шостага школьнага дня ў школе прайшоў сеанс адначасовай гульні па шашках "Чэмпіён супраць усіх".

Вучні 9 класа прынялі ўдзел у Тыдні лесу: пасадзілі саджанцы пладовых дрэў на тэрыторыі школы. Педагагічны калектыў, работнікі школы і навучэнцы наводзілі парадак у школьным садзе.









Шосты школьны дзень **30 красавіка** прайшоў пад дэвізам "Дзень вясны і працы".

Вучні 3-9 класаў прынялі ўдзел у велабіятлоне. Прадстаўнікі школьнай піянерскай дружыны "Іскарка" (Далжук Дар'я, Крамянеўскі Дзяніс, Ярашэвіч Мар'яна і Шацко Цімафей) удзельнічалі у раённым марафоне “Піянер DZR. На ўсе 100”.

Калектыў школы і вучні прынялі ўдзел у працоўным дэсанце "Добра працуеш - павагу маеш" па падрыхтоўцы да святочных раённых мерапрыемстваў.







Рэдкалегія: вучні 5 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 5 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 31 мая.